ААВЛ

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

***А.А. Корзюк***

# ВЫВУЧЭННЕ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ КАНЦА XVIII – ПАЧАТКУ XX ст. У АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНАЙ ШКОЛЕ

Репозиторий БГПУ

Рэкамендавана Вучэбна-метадычным аб'яднаннем
вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь па педагагічнай
адукацыі ў якасці вучэбна-метадычнага дапаможніка для студэнтаў
вышэйшых навучальных устаноў, якія навучаюцца па спецыяльнасцях:
1-020101 Гісторыя; 1-020102 Гісторыя. Дадатковая спецыяльнасць

Мінск 2010

БГПУ БИБЛИОТЕКА
ИНВ. № УК 4721

6. Гісторыя Беларусі ў літаратурных вобразах (дакастрычніцкі перыяд) / склад. М.Р. Гнеўка. Мінск, 1979.
7. Запрудский Н.И. Современные школьные технологии: пособие для учителей. 2-е изд. Минск, 2004.
8. Авдеев И. Организация школьного исторического Интернет-образования // Гісторыя: праблемы выкладання. 2008. № 10. С. 38–46.
9. Драхлер А.Б. Ресурсы Интернета и уроки истории в средней школе // Настольная книга учителя истории: 5–11 классы / авт.-сост. М.Н. Чернова. М., 2006. С 78–109.
10. Метадычныя рэкамендацыі па выкарыстанні графікаў пры вывучэнні рэвалюцыйных падзей змешчаны ў артыкуле: Бельский Э.Н. Как использовать графики при изучении революций в России // Преподавание истории в школе. 2007. № 7. С. 23–25.



ГЛАВА

# 4 МЕТОДЫКА ВЫВУЧЭННЯ АСОБНЫХ ТЭМ ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ КАНЦА XVIII – ПАЧАТКУ XX ст.

## 4.1. Тэма «Палітыка расійскага ўрада ў Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XIX ст.»

Пры вывучэнні дадзенай тэмы неабходна арганізаваць вучэбна-пазнавальную дзейнасць вучняў па вызначэнні змен у грамадска-палітычным уладкаванні беларускіх зямель пасля далучэння да Расійскай імперыі і характарыстыцы сацыяльна-эканамічнай палітыкі царскага ўрада ў дачыненні да насельніцтва Беларусі. Для рэалізацыі адзначанай мэты настаўнік можа выбраць такую форму правядзення ўрока, як лабараторныя заняткі. Падчас іх вучні ў групах працуюць з картай, гістарычнымі дакументамі і тэкстам вучэбнага дапаможніка. Прапануем дакументальныя матэрыялы з распрацаванымі пытаннямі і заданнямі для правядзення падобнага ўрока. Адзначым, што тэксты прадстаўлены на мове і з усімі лінгвістычнымі асаблівасцямі арыгінала, некаторыя з іх скарочаны. Устаўкі ў тэксты, якія не з'яўляюцца часткай арыгінала, заключаны ў квадратныя дужкі. Скарочаныя месцы ў тэкстах пазначаны шматкроп'ем у квадратных дужках.

### Дакумент 1. Аб інстытуце губернатараў у Расійскай імперыі [1]

Інстытут генерал-губернатараў і губернатараў абавязаны сваім узнікненнем Санкт-Пецярбургу. На Заячым востраве была закладзена крэпасць. Пётр І прызначыў генерал-губернатарам будучага горада А.Д. Меншыкава. Губернатарскія пасады ў астатняй Расіі былі ўведзены ў 1708 г. – з адначасовым падзелам тэрыторыі дзяржавы на восем губерняў. Улада генерал-губернатара распаўсюджвалася на справы грамадзянскія і вайсковыя: яму падпарадкоўваліся войскі гарнізонаў, пад яго наглядам знаходзіліся суд, паліцыя, фінансы, падатковыя службы, мытня, рэкруцкія наборы, пытанні будаўніцтва, гаспадаркі, яму таксама даручалася сачыць «за состояннем умов» у губерні.



Репозиторий БГПУ